# МУЗЫЧНАЕ МАСТАЦТВА РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ: ЗАХАВАННЕ ТРАДЫЦЫІ НА ДОКШЫЧЧЫНЕ

**В.І. Раманенкава**
*аспірант кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Хрысціянства, якое распаўсюдзілася па ўсіх еўрапейскіх дзяржавах, дало імпульс для развіцця самабытнага музычна-песеннага мастацтва ў кожнай мясцовай Царкве. Паступовая секулярызацыя[1] свядомасці людзей прывяла да з'ўлення новага музычнага мыслення, якое было накіравана на эстэтычную асалоду ад прыгажосці музычных сугуччаў і росквіту інструментальнай музыкі.

Напрацягу ўсёй сваёй гісторыі Рымска-каталіцкая царква ганарылася і працягвае ганарыцца выдатнымі навукоўцамі, кампазітарамі, тэарэтыкамі, спевакамі, музыкамі. Мастацтва і музыка непарыўна крочылі па дарозе жыцця царквы і яе вернікаў.

Яшчэ ў IV стагоддзі Святы Аўгустын казаў: «Quis cantat, bis orat» (Хто спявае – той двойчы моліцца). Зразумела, што святы меў на ўвазе таго, хто спявае духоўныя песні, той двойчы моліцца. У жанры рэлігійнай музыкі найбольш яскрава праяўляецца камунікатыўнасць – малітоўная сувязь чалавека з Богам. Спеву здаўна надавалася вялікае значэнне ў жыцці хрысціян. Існавала вялікая колькасць харавых калектываў прафесіянальных і аматарскіх.

Айцы цырквы ўжо ў IV–V стагоддзях пісалі аб уздзеянні музыкі на душу чалавека. Яны прызнавалі, што музыка спрыяе глыбіні малітвы чалавека, а дакладней, музыка вакальная. Людзкія галася (асабліва мужчынскія) заўсёды былі асновай музычнай малітвы хрысціянскай царквы.

Беларуская зямля вельмі унікальная адносна рэлігійнай музыкі Рымска-каталіцкай царквы. На Беларусі з пакон вякоў працавала шмат замежных святароў, мастакоў, музыкаў, спевакоў, кампазітараў. І ўсе гэтыя людзі заўсёды прыносілі сваю нотку мастацтва, якое ў сваю чаргу вельмі маляўніча асімілявалася з традыцыйнай беларускай культурай.

У выніку такога працэсу сфармаваліся свае асаблівыя стылі спеваў, абрадаў у розных частках Беларусі. У дадзенай працы ўвага накіравана на музычную каталіцкую традыцыю Докшыцкага раёна, што на Віцебшчыне. Гэта тэрыторыя па якой праходзіла граніца былых Польскай і Русскай дзяржаў. Безумоўна на рэлігійны спеў мясцовых жыхароў аказалі ўздзеянне абедзве культуры ў непарыўнай лучнасці з уласна беларускай традыцыяй.

Докшыцы ніколі не з'яўляліся цэнтрам ані эканамічнага, ані палітычнага, ані культурнага жыцця краіны. Але як і кожнае беларусскае мястэчка маюць

[1] Секулярызацыя (лат. Saecularis – мірскі, свецкі) – працэс зніжэння рэлігійных пачуццяў ў свядомасці людзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

багатую гісторыю. Да 1793 г. Докшыцы знаходзіліся на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, з 1793г., пасля яе другога падзелу, мястэчка адышло да Расійскай Імперыі, з 1921 па 1939 гг. – у складзе Польшчы, з 1939 г. – у складзе БССР і СССР, з 1991 г. – у Рэспубліцы Беларусь [1, с. 216].

27 снежня 1608 года ў Докшыцах пачалі працу па будаўніцтву касцёла. Ад моманту заснавання касцёла дзейнічала парафіяльная школа ў якой навучалі дзяцей. Настаўнікам быў арганіст касцёла, які вучыў дзяцей не толькі чытаць і пісаць, але і спяваць пад час літургіі.

У 1793 г. для Докшыцкага касцёла быў набыты 12-галосны арган. У парафіі існавала традыцыя пасля кожнай імшы спяваць малітву за памерных «Анёл панскі». Гэта традыцыя жыве ў парафіі па сённяшні дзень. У вігілію святаў, у святы і нядзелі спяваліся нешпары[2] (традыцыя захавалася) [2, с. 18].

Хрысціянскія вернікі на тэрыторыі Докшыччыны перажылі шмат розных падзей (войны, паўстанні, пажары, падзелы), але нічога не затрымала імкнення да веры, да малітвы. У часы забароны хрысціянства людзі тайна збіраліся ў дамах, альбо на могілках і маліліся. Несумненна маліліся найчасцей песнямі і песні набывалі кожны раз усё больш і больш традыцыйны фальклорны характар. Потым, калі касцёл зноў быў адчынены для вернікаў, большасць з тых песень была перанесена ў літургічную практыку. На дадзены момант пад час некаторых набажэнстваў у докшыцкай святыні можна яшчэ пачуць фальклорна-афарбаваныя песні (што праяўляецца як ў стылістыцы выканання, так і ў тэкстах песень). Зразумела, што такі рэпертуар ведаюць толькі старэйшыя жыхары мястэчка.

Маладзейшае пакаленне, людзі, якія нарадзіліся ў другой палове дваццатага стагоддзя, спяваюць зусім іншы рэпертуар у каталіцкім храме. Але пры некаторых касцёлах існуюць спеўныя супольнасці, якія стараюцца ўзнавіць традыцыю кананічнага літургічнага спеву Рымска-каталіцкай царквы.

У Докшыцах існуе харавы калектыў, які складаецца з 23 чалавек рознага ўзросту, розных прафесій, і нават не толькі каталіцкага веравызнання, але і праваслаўнага. Гэтыя дзве супольнасці (каталіцкая і праваслаўная) вельмі цесна існавалі на працягу ўсёй гісторыі хрысціянства на докшыцкай зямлі. Калі касцёл згарэў, а каталіцкім святарам не дазвалялася працаваць (у часы Расійскай імперыі), католікі хадзілі да праваслаўных святароў, каб ахрысціць дзяцей альбо пахаваць памерлага. Людзі жылі і па сёняшні дзень жывуць пад дэвізам «Бог адзін».

Хор парафіі святой Тройцы ў Докшыцах пачаў сваё існавання 4 красавіка 2010 года. Гэта хор змешанага тыпу (складаецца з мужчынскіх і жаночых галасоў). Не вельмі часта на сённяшні дзень у «правінцыяльных» беларускіх цэрквах можна сустрэць мужчынскія галасы ў харах. Тым больш,

[2] Нешпар – 1. У літургіі Рымска-каталіцкай царквы: вячэрняе набажэнства, якое спявалася ў нядзелі і святочныя дні. 2. Частка малітвы з брэвярыя (зборнік малітваў), якая спяваецца ўвечары [4, с. 93].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што ў докшыцкім хоры колькасць мужчынскіх галасоў збалансавана з жаночымі (жаночыя галасы не пераважаюць).

Дэбютаваў хор на найвялікшай урачыстасці Рымска-каталіцкай царквы – Уваскрасенне Хрыста з пасхальным рэпертуарам але вельмі рознапланавым. На літургіі выконваліся: рэлігійная песня[3] («Аллелюя Бог ускрос»); кананічная чатырохгалосная малітва на лацінскай мове («Agnus Dei»); твор сучаснага кампазітара Д. Куша («З радасцю усклікні»); традыцыйны каталіцкі літургічны спеў («Б'юць званы» пераклад з польскамоўнай песні «Alleluja biją dzwony»). Удзельнічаючы ў літургіі Рымска-каталіцкай царквы немагчыма амінуць такі від песнапенняў, як грыгарыянскі харал[4]. Гэта той від спеву з якога вядзе адлік прафесійная каталіцкая літургічная музыка. На харале заснаваны галоўныя часткі каталіцкай Святой Імшы – гэта аднагалосны спеў з мноствамі распеваў. Гэта не проста спеў, а свайго роду малітоўнаўная медытацыя, разважанне. Для запісу грыгарыянскага хаpалу выкарыстоўвалі натацыю розных відаў (літары, мензуральная натацыя, сальмізацыя і інш.), залежна ад эпохі. У познім сярэднявеччы пачалі выкарыстоўваць натацыю, якая называецца неўменнай[5]. Докшыцкі хор выконвае некаторыя творы («Vidi aquam») з такім неўменным запісам і спявае па сярэднявечных нотах.

З 2010 году хор заўсёды суправаджае ўсе святы Рымска-каталіцкага прыходу ў Докшыцах: Пасха, Спасланне духа Святога, день Святой Тройцы, дзень памяці ўсіх памерлых, Божае нараджэнне. Акрамя вялікіх гадавых святаў харысты ўшаноўваюць спевам некаторых святых, якія маюць непасрэднае дачыненне да жыцця парафіі: гэта святая Марыя дэ Маціяс (заснавальніца ордэна сясцёр Адараторак Крыві Хрыста, якія працуюць у докшыцкай парафіі) і Святы Францішак (заснавальнік францысканскага ордэну братоў капуцынаў да якіх належаць айцы і браты законныя докшыцкай парафіі), а таксама Святая Цэцылія (з'яўляецца апякункай касцёльнай музыкі). Неаднаразова спеў хора суправаджаў святарскія і масскія пасведчанні братоў і сясцёр законных.

Манера спеву хору крыху незвычайная. Гэта не класічны акадэмічны спеў, а простая бытавая манера, набліжаная да акадэмічнай. Удзельнікі хору – гэта людзі без музычнай адукацыі і спяваюць разам не так даўно, таму манера атрымалася вельмі самабытная і каларытная. У рэлігійнай музыцы галоўнае – сэнс, змест і тое што чалавек спявае ад сэрца, з душой і шчыра. Святы

[3]Рэлігійнай песняй называецца народная музычная практыка, якая існуе ў паўсядзённым жыцці і выкарыстоўваецца кожны раз пры тых ці іншых абставінах з яснымі практычнымі мэтамі: абазначыць, высветліць асновы адносін чалавека да Бога, пазнаць асновы веры. Іншымі словамі, гэта музыка, якая ўваходзіць у быт і ўдзельнічае ў ім, абапіраючыся на хрысціянскія каштоўнасці. Рэлігійная песня лучыць у сабе дзве музычныя традыцыі рэлігійную і народную.

[4]Тэрмін «грыгарыянскі харал» паходзіць ад імя Грыгорыя I Вялікага (папа Рымскі ў 590–604 гадах). Грыгорый Вялікі саставіў літургічны абіход (зборнік літургічных песнапенняў «Антыфанарый» ).

[5] Неўменная натацыя – запіс нот пры дапамозе знакаў (кропак (punctum), крэсак (virga)), але не заўжды яны паказвалі дакладны чыс трывання ноты альбо дакладную вышыню ноты. Спачатку запісывалася такая натацыя без ліній, а пазней на чатырох лініях [3, с. 84].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Геронім казаў, што нават «выцце касцёльнае» можа быць прыемным для Бога, калі яно (выцце – непрыемны, фальшывы спеў) выходзіць ад чыстага сэрца.

Докшыцкі хор яшчэ не можа спяваць творы міравой каталіцкай класікі, напрыклад месы Моцарта, Баха (у сілу недахопу тэхнічных магчымасцяў), але некаторыя часткі з тых ці іншых кампазіцый выконвае: хор «Алелюя» з араторыі «Месія» Гендэля, «Ода да радасці» хор з 9 сімфоніі Бетховена. І гэта таксама вельмі знакава для простага парафіяльнага хору маленькага гарадка на Беларусі. Па-першае, такія творы развіваюць кругагляд не толькі спевакоў, але і вернікаў, якія прыходзяць у храм памаліцца. Па-другое, такія творы дазваляюць харыстам выпрацоўваць больш складаную вакальную тэхніку (у параўнанні з той, якой яны валодаюць).

Хор спявае не толькі у докшыцкай святыні. Спевакі падзяліліся сваёй музычнай малітвай з вернікамі суседніх парафій: в. Валкалата, в. Даўгінава, в. Бярозаўка, в. Гняздзілава, в. Порплішчы.

Каталіцкай літургіцы заўсёды спадарожнічала музыка. Пытанні рэлігійнай музыкі закраналі навукоўцы і тэарэтыкі ўсіх культурна-гістарычных эпох. Сучаснае кіраўніцтва Рымска-каталіцкай царквы не абмінае ўвагай літургічны спеў. Гэта тэма неаднаразова абмяркоўвалася кардыналамі і музычнай радай царквы.

Па інфармацыі Ватыканскага радыё, кардынал Джанфранка Равазі падкрэсліў, што, акрамя музыкі мінулых часоў, Касцёл мае патрэбу ў вялікіх сучасных музыкантах, творы якіх дазволілі б перажываць літургію дзякуючы новай мове. На думку кардынала, жаданне чуць у касцёле музыку простую і зразумелую не можа прывесці да яе баналізацыі; у творах заўсёды павінна захоўвацца сакральнае вымярэнне.

Рыкарда Муці, у сваю чаргу, адзначыў, што літургічная музыка павінна быць вельмі простай, каб яе маглі разумець і ўспрымаць усе. «Музыка павінна мець здольнасць падняць дух тых, хто прыходзіць у касцёл маліцца, але таксама і тых, хто не з’яўляецца вернікамі. Увесь свет прасякнуты гукамі, якія мы не можам зразумець, але яны нас пранізваюць і дазваляюць быць істотамі, створанымі для музыкі», – сказаў італьянскі кампазітар [5].

Хрысціянская музычная культура захоўвалася і актыўна развівалася да пачатку XX стагоддзя. А потым, на некаторы час затрымалася. Але рэлігійнае музычнае мастацва толькі візуальна страціла сваю значнасць. У бытавым асяродку людзей, у іх сэрцах і душах заўсёды жыла музычная рэлігійная традыцыя. Гістарычныя падзеі, развіццё грамадства, навукі, свядомасці людзей усё гэта мае непасрэдны адбітак на хрысціянскай музыцы. І у руках нашага пакалення на пачатку XXI стагоддзя ўзнавіць, адрадзіць і захаваць тое, што так старанна аберагалася і перадавалася нам.

1. *Памяць :* гіст.-дакум. хроніка Докшыцкага раёна / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 2004. – 752 с.

2. *Wskrzeszenia* na pograniczu dwóch światów / sklad i red. o. Jan Fibeka. – Warszawa : Nowy Miasto n/Pilicą, 2011. – 280 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Hinz, E.* Chorał gregoriański. Wyd. III poprawione / E. Hinz. – Pelplin : Wyd. «Bernardinum», 1999. – 149 c.
4. *Słownik* języka polskiego PWN. T. 1–2. – Warszawa : Wydawnictwo Naukowe PWN, 2007. – 521+ 598 s.
5. *Кардынал* Равазі: Касцёл патрабуе сучаснай сакральнай музыкі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://catholic.by/2/home/ world/ news/40-foreign/112812-sakrmuzyka.html. – Дата доступа : 07.06.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ